**Райчонак, С.** Гады мінаюць незваротна, а памяць застаецца / С. Райчонак // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2021. — 13 лют. — С. 2.

## ГАДЫ МІНАЮЦЬ НЕЗВАРОТНА, А ПАМЯЦЬ ЗАСТАЕЦЦА

***Няўмольны бег часу ўсё больш аддаляе нас ад часоў Афганскай вайны 1979–1989 гадоў. Але ў памяці тых людзей, якім лёсам было наканавана прайсці шляхамі ваенных дзеянняў пад палаючым сонцам чужой краіны, назаўсёды застануцца дні і хвіліны, праведзеныя ў Афганістане.***



Віктар Шокель, як і іншыя салдаты тэрміновай службы, не думаў, што дваццацігадовым юнаком трапіць на чужыну, каб са зброяй у руках змагацца з душманамі.

– Нарадзіўся я ў вёсцы Белы Двор, – кажа Віктар Часлававіч. – Пасля заканчэння Германавіцкай сярэдняй школы набыў спецыяльнасць вадзіцеля ў Відзаўскім СПТВ. Працаваў шафёрам у тагачасным калгасе «Буравеснік». Пасля атрымання павесткі з райваенкамата, трапіў на службу ў Барысаў. У хуткім часе перавялі мяне ў вучэбную часць горада Вінніца, што на Украіне. Там абучалі стральбе з усіх відаў зброі, тлумачылі, як паводзіць сябе пры варожым абстрэле. Пасля Вінніцы я трапіў у «вучэбку» ў Баранавічы, а потым непасрэдна на афганскую зямлю.

Першапачаткова служыў у роце аховы. Нашымі асноўнымі функцыямі былі ахова Палаца Аміна і аўтатрасы, якая вяла да яго. Праз некаторы час я быў пераведзены ў горад Шынданд. Менавіта там я ўпершыню трапіў у бой з незаконнымі бандфарміраваннямі. Упершыню ўбачыў, як гінулі саслужыўцы. Давялося і самому весці агонь па ворагу, на сваіх руках выносіць з поля бою параненых і, на вялікі жаль, забітых савецкіх салдат.

Разам са мной службу неслі мае землякі: Юрый Сучкоў і Франц Лагун. Нечаканай і незабыўнай была сустрэча з маім таварышам дзяцінства Аляксандрам Лагунёнкам. Ён служыў у аўтабаце. Аднойчы каля месца, дзе размяшчалася наша рота, спынілася калона грузавых аўтамабіляў. Сярод мноства салдат я разгледзеў постаць свайго земляка. Гэту цёплую сустрэчу мы да дробязей памятаем і цяпер. Вялікая краіна Афганістан у той час аказалася настолькі маленькай, што на яе тэрыторыі я спаткаў свайго сябра з суседняй вёскі.

Чатырнаццаць месяцаў я правёў у Афгане, а на малую радзіму вярнуўся 31 снежня 1981 года. Непрацяглы час жыў і працаваў у Даўгаўпілсе. А калі маці спатрэбілася мая дапамога, пераехаў да яе ў вёску Янішкі Більдзюгскага сельсавета. У гэты ж час пазнаёміўся з маладой дзяўчынай Ірынай, з якой і пажаніліся. Працаваў вадзіцелем-санітарам у райветстанцыі. Пасля выбуху на Чарнобыльскай АЭС двойчы быў камандзіраваны на ліквідаванне наступстваў тэхнагеннай катастрофы.

Вось ужо больш за трыццаць год разам з Ірынай жывём у Кубелеўшчыне. Мая другая палова ўжо знаходзіцца на заслужаным адпачынку, а я працую жывёлаводам, даглядаю буйную рагатую жывёлу на ферме вёскі Янішкі.

15 лютага мы, воіны-інтэрнацыяналісты, у чарговы раз сустрэліся ў гарадскім пасёлку каля помніка «Чорны цюльпан». Разам успомнілі гады ваеннага ліхалецця, прыгадалі ў думках сваіх сяброў, якія назаўсёды засталіся на чужыне, памаліліся за супакой іх душ і падзякавалі Усявышняму за падоранае нам жыццё пад мірным небам роднай Беларусі.

**Сяргей РАЙЧОНАК.**